**23.** Які грыб называецца ў народзе каралём грыбоў?

**А)** вясёлка; **Б)** падасінавік; **В)** апенька; **Г)** баравік; **Д)** мухамор.

**24.** Укажыце, дзе правільна пазначаны марфемы ў слове пагалоска:

**А)** пагалоска; **Б)** пагалоска; **В)** пагалоска;

**Г)** пагалоска; **Д)** пагалоска.

**25.** Што робіць маляр?

**А)** з цэглы будуе дом; **Б)** фарбуе сцены, падлогу, дзверы;
**В)** малюе карціны; **Г)** размалёўвае пад'езды;
**Д)** марыць.

**26.** Пра якую жывёлу кажуць, што яна мае хвост, як у рыбы, а заднія лапы, як у качкі?

**А)** бабёр; **Б)** тхор; **В)** барсук; **Г)** мядзведзь; **Д)** заяц.

**27.** Вызначце, у якіх словазлучэннях дапушчана памылка:

*1) даччыно паліто; 2) мішаў сшытак; 3) вавёрчына знаходка;*
*4) Васеў верш; 5) Коласавы словы; 6) Братаў успамін.*

**А)** 1, 3; **Б)** 2, 4; **В)** 4, 6; **Г)** 1, 4; **Д)** 2, 6.

**28.** Якія ягады маюць чырвона-чорны з бурштынавым бляскам колер і салодка-гаркавы смак?

**А)** суніцы; **Б)** брусніцы; **В)** чарніцы; **Г)** маліны; **Д)** ажыны.

**29.** Які раздзел мовазнаўства вывучае фанемы ?

**А)** фанетыка; **Б)** фаналогія; **В)** фразеалогія;
**Г)** арфаграфія; **Д)** тэрміналогія.

**30.** Хто стварыў самую першую граматыку на царкоўнаславянскай і беларускай мовах ?

**А)** Францыск Скарына; **Б)** Лаўрэнцій Зізаній; **В)** Мікола Гусоўскі;
**Г)** Іван Фёдараў; **Д)** Мілецій Сматрыцкі.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА («Буслік»).*
*тэл. (017) 232 80 31, 239 91 72; e-mail: kenguru_belarus@mail.ru*
*http://bak.academy.edu.by*

## Конкурс па беларускай мове
## **"БУСЛІК-2005"**

*Чацвер, 20 студзеня 2005 года*

### Заданне для вучняў 4-5 класаў

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна адказалі на пытанне;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

**1.** Якая літара ў беларускай мове не мае гука?

**А)** ў; **Б)** й; **В)** ф; **Г)** ь; **Д)** і.

**2.** Падлічыце, колькі ўсіх галосных літар у дадзеных словах:

1) *хлеб*; 2) *колас*; 3) *неба*; 4) *сонца*; 5) *вада*; 6) *вецер*.

**А)** 8; **Б)** 12; **В)** 9; **Г)** 11; **Д)** 10.

**3.** У якіх словах зычныя толькі зацвярдзелыя?

1) *шэры*; 2) *Шура*; 3) *Саша*; 4) *Жора*; 5) *ружа*; 6) *Рома*.

**А)** 1, 3, 5, 6; **Б)** 1, 2, 4, 5; **В)** 2, 4, 5, 6; **Г)** 2, 3, 4, 5; **Д)** 1, 2, 4, 6.

**4.** У якіх словах прыстаўка заканчваецца на літару ***с***?

1) *ра…казаць*; 2) *ра…мова*; 3) *ра…губіцца*;
4) *ра…шпіліць*; 5) *ра…чыніць*; 6) *ра…гневацца*.

**А)** 1, 2, 4; **Б)** 2, 4, 5; **В)** 3, 5, 6; **Г)** 2, 3, 6; **Д)** 1, 3, 5.

**5.** Якія словы маюць аднолькавую колькасць літар?

1) *поспех*; 2) *быць*; 3) *з'есці*; 4) *дзед*; 5) *адзінокі*; 6) *сям'я*.

**А)** 1, 3, 4; **Б)** 1, 3, 5; **В)** 2, 4, 5; **Г)** 2, 4, 6; **Д)** 3, 4, 6.

**6.** У якіх словах трэба пісаць літару ***ў*** ?

1) *жа..рук*; 2) *не..забаве*; 3) *кло..н*;
4) *па..за*; 5) *рады..с*; 6) *а..дыторыя*.

**А)** 1, 2, 5; **Б)** 2, 4, 6; **В)** 3, 5, 6; **Г)** 1, 2, 4; **Д)** 1, 3, 6.

**7.** У якім з рэбусаў зашыфравана назва кветкі?

**А)** 

**Б)** 

**В)** 

**Г)** 

**Д)** 

.

**8.** Колькі разоў сустракаецца спалучэнне літар ***зуб*** у скорагаворцы "*зубраня зубрыла азбуку, зубрыла, зубрыла і вызубрыла*"?

**А)** няма такога слова; **Б)** 3; **В)** 5; **Г)** 4; **Д)** 6.

**9.** Певень кукарэкае, кот мяўкае, бусел клякоча. А як падае голас сава?

**А)** кугакае; **Б)** кігікае; **В)** кракае; **Г)** стракоча; **Д)** шчабеча.

**10.** Пра якую птушку гаворыцца ў вершаваных радках М. Арочкі?

*Глядзіць яна з бярозачкі,*
*на крылах – дзве палосачкі,*
*галоўка з сіняй шапачкай*
*і дзюбу чысціць лапачкай.*

**А)** аўсянка; **Б)** берасцянка; **В)** чаротаўка; **Г)** сарока; **Д)** сініца.

**11.** Вызначце, у якіх словазлучэннях галоўным словам з'яўляецца назоўнік:

1) *ведаў адказы;* 2) *імкненне да ведаў;* 3) *добры настрой;*
4) *некуды збег;* 5) *драўлянае біла;* 6) *моцна біла.*

**А)** 2, 3, 5; **Б)** 1, 2, 4; **В)** 2, 4, 5; **Г)** 1, 3, 5; **Д)** 2, 3, 4.

**12.** Што беларусы называюць другім хлебам?

**А)** гамбургер; **Б)** батон; **В)** бульбу; **Г)** пячэнне; **Д)** абаранкі.

**13.** Сымонка вельмі хацеў ведаць, які падарунак падрыхтавала Аленка. Дзяўчынка зашыфравала назву ў сказе: "*Калі не ідуць госці абутыя*". Дапамажыце Сымонку даведацца, што яго чакае дома:

**А)** боты; **Б)** шкарпэткі; **В)** кніга; **Г)** альбом; **Д)** канструктар.

**14.** Закончыце прыказку "*будзе і на крапіву ...*"

**А)** ураджай; **Б)** насенне; **В)** мошак; **Г)** мароз; **Д)** продаж.

**15.** У якіх словах спалучэнне літар ***дз*** і ***дж*** абазначае два гукі?

*1) дзядзя; 2) падзівіцца; 3) падземны;*
*4) подзвіг; 5) аджыць; 6) адзенне.*

**А)** 1, 5; **Б)** 2, 6; **В)** 3, 5; **Г)** 2, 4; **Д)** 4, 6.

**16.** У якіх словазлучэннях парушаны марфалагічныя нормы беларускай мовы?

*1) гарачая кава; 2) моцная боль; 3) вялікі гусь;*
*4) спелы яблык; 5) смачны пюрэ; 6) новы фільм.*

**А)** 1, 2, 5; **Б)** 1, 3, 4; **В)** 2, 3, 5; **Г)** 2, 4, 5; **Д)** 3, 4, 5.

**17.** Колькі антанімічных пар ужыта ў прыказцы "*есці хлеб траякі: чорны, белы і ніякі*" ?

**А)** няма пар; **Б)** 1; **В)** 2; **Г)** 3; **Д)** 4.

**18.** Дадзены словы:

*1) міля; 2) барэль; 3) метр; 4) літр; 5) сажань.*

Якія з іх абазначаюць меру ёмкасці?

**А)** 1, 2; **Б)** 3, 4; **В)** 4, 5; **Г)** 2, 4; **Д)** 3, 5.

**19.** Што робіць чалавек, які карыстаецца прасам?

**А)** танцуе; **Б)** плача; **В)** прасуе; **Г)** гандлюе; **Д)** малюе.

**20.** Вызначце правільны парадак размяшчэння слоў у крыжаванцы. Пры паспяховым выкананні ў выдзеленым вертыкальным радку прачытаеце псеўданім беларускага паэта Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча.



*1) Броўка; 2) Верас; 3) Зуёнак; 4) Купала; 5) Лялько.*

**А)** 4, 3, 2, 5, 1; **Б)** 2, 5, 1, 4, 3; **В)** 5, 1, 4, 3, 2;
**Г)** 3, 1, 4, 5, 2; **Д)** 2, 5, 4, 1, 3.

**21.** Якія галосныя літары неабходна ўставіць замест кропак у слове *н..п..рст..к*? Гэта назва абазначае металічны каўпачок, які надзяваецца на палец пры шыцці для засцярогі ад уколу.

**А)** а, а, а; **Б)** а, э, а; **В)** а, ё, а; **Г)** а, о, а; **Д)** е, э, э.

**22.** Колькі памылак дапушчана ў сказе?

*Снех рыпіць і асідае пат цяшкімі крокамі.*

**А)** няма памылак; **Б)** 2; **В)** 4; **Г)** 3; **Д)** 5.